ДУК ”Ушацкая цэнтралізаваная сістэма“
Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# МАТЫРЫНСКАЯ СПАДЧЫНА:

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ





УШАЧЫ



Простае шчасце людское.
Так як і наша з табою
Пэўна складаецца з солі,
З хлеба сабранага ў полі,
З поту, дарожнага пылу,
З роднага небасхілу,
З дружбы мацнейшай да смерці
З песні…і так мне здаецца
Каб з чаго іншага скласці,
Дык ці было б гэта шчасцем?

М.Танк

Змест


1 Гісторыя заснавання гурта…………………………… 4
2 Спяваюць тое, што чулі з дзяцінства……………….. 7
3 Не з нот, а з голасу: аўтэнтычна…………………….. 10
4 Песням не будзе канца……………………………. 13
5 Выкарыстанная літаратура…………………………... 16

# ГІСТОРЫЯ ЗАСНАВАННЯ ГУРТА

3 сакавіка 1987 года па ініцыятыве мастацкага кіраўніка Матырынскага сельскага дома культуры Рудзёнак Галіны Сяргееўны, было вырашана стварыць фальклорны гурт ”Матырынскаая спадчына“, які пачынаў працаваць у саставе 10 жанчын.

Галіна Сяргееўна родам з Міёршчыны. З захапленнем прыгадвае дамашнія вечары. Хоць маці працавала даяркай, а бацька брыгадзірам, ды было шэсць дзяцей, вольнага часу было мала, усё роўна для весялосці яго выкрайвалі. У святы збіраліся сябры дарослых, частаваліся, спявалі песні, прыпеўкі. ”Мы і сям’ёй танцы дома наладжвалі, – расказвае Галіна Сяргееўна. – Бацька быў гарманіст, таму музыка гучала часта. Уся сям’я любіла спяваць і танцаваць“.

Культработнікам жанчына стала не выпадкова.

– У 1986 годзе я выйшла замуж, пераехала жыць у сям’ю мужа, у вёску Матырына, – расказала Галіна Сяргееўна. – У тым жа годзе стала працаваць мастацкім кіраўніком у мясцовым Доме культуры. І хацелася мне прыўнесці ў справу нешта сваё, адметнае, бо рабіць штосьці па чужых шаблонах у культуры – не заўсёды лепшы шлях. Вось і прыглядвалася да людзей, прыкідвала: з чаго б пачаць? І аднойчы пачула, як спявае бабуля мужа, Ірына Дзмітрыеўна Рудзёнак. То было нешта незнаёмае, але вельмі душэўнае. Прычым спявала жанчына нягучна, не на паказ – для сябе. Вось гэтая народная песня і падштурхнула мяне на стварэнне фальклорнага гурта пры вясковым Доме культуры. Тады мне здавалася, што мы, маладзейшыя, многае ўжо не ведаем, страцілі з духоўнай спадчыны мінулых пакаленняў, а бадай ці не кожная з народных песень – гэта ж сапраўдная культурная каштоўнасць. І

хацелася захаваць хаця б тое, што яшчэ жывое ў памяці нашых матуль і бабуль.

Галіна з энтузіязмам узялася за справу. Значную дапамогу пры стварэнні фальклорнага гурта адчувала з боку бабулі мужа: тая падказвала, якіх людзей можна запрасіць, чые песні паслухаць, у каго павучыцца манеры спявання, народнаму выканальніцкаму майстэрству. Давялося быць і арганізатарам, і тонкім псіхолагам: бабулі ж ніяк не хацелі выходзіць на сцэну! Як вядома, у беларусаў пры ўсёй павазе да старэйшых спрадвеку лічылі, што ў цэнтры ўвагі павінны знаходзіцца маладыя, ім трэба даваць дарогу. Ну а ”ролі“ людзей паважанага узросту – на другім, як кажуць кіношнікі, плане: сядзець недзе збоку ды любавацца моладдзю, якая спявае і таньчыць. Але як быць, калі пераемнасць культурна-спеўных традыцый парушылася? Можа, варта ветэранам і прыклад маладзейшым паказаць? Галіна хадзіла па хатах – разам з добраахвотнай памочніцай Ірынай Дзмітрыеўнай. Як магла ўгаворвала патэнцыяльных артыстак, прыводзіла прыклады. Прычым наведвацца ў некаторыя хаты даводзілася па некалькі разоў.

Паступова сцяна недаверу танчэла. Патрохі пачаліся сходкі-спеўкі. Але праходзілі яны не ў Доме культуры. Каб не адрываць бабуль ад звыклага быту, Галіна Сяргееўна прыдумала ”хатнія спеўкі“: запрашала бабуль на гарбату. Спачатку вяліся размовы пра жыццё-быццё, а потым гучалі і песні.

Калі нешта пачало атрымоўвацца, сходкі тыя сталі называцца рэпетыцыямі. Іх ужо чакалі, да іх рыхтаваліся. А як нешта не атрымлівалася ды якая артыстка не магла своечасова прыйсці на рэпетыцыю, то гэта была ўжо для яе ледзь не трагедыя. Так, лічыць Галіна Сяргееўна, праяўлялася ў матырынскіх сялянках савецкая загартоўка:

яны ж умелі працаваць і толькі за ідэю, ”за палачку“-працадзень. І жанчына-арганізатар так павяла справу, што сталі самадзейныя артысткі лічыць калектыўныя спевы ўжо не толькі задавальненнем, прыемным баўленнем часу, але і грамадскай значнаю працаю.

– Гэта цяпер іх сярод ночы разбудзі, папрасі выступіць – не адмовяць, – гаворыць Галіна Сяргееўна. – А тады не хацелі, не ведалі, што гэта за калектыў будзе.

І ўсё ж Галіна Сяргееўна здолела сабраць разам носьбітаў народнай культуры і аб’яднаць іх. Кіраўніком калектыву з 2004 года працавала Аляксандра Іванаўна Рудзёнак, з 2016 – Галіна Сяргееўна Рудзёнак.

# СПЯВАЮЦЬ ТОЕ, ШТО ЧУЛІ З ДЗЯЦІНСТВА

Спачатку самадзейнымі артысткамі ў новастворанымгурце сталі Зінаіда Аляксандраўна Аўласенка, Ірына і Зінаіда Аляксееўна Рудзёнак, Марыя і Ніна Шараг, Валянціна Васільеўна Шалак, Марыя Цісковіч, Лізавета Салаўёва, Александрына Аляксееўна і Надзея Паўлаўна Собаль, Ганна Андрэеўна Холад, Арына Дмітрыеўна Рудзёнак, Аксіння Пятроўна Цішкова, Лізавета Фёдараўна Салаўёва, Надзея Ануфрыеўна Рудзёнак.







Многіх з тых жанчын ужо няма на гэтым свеце.

Галіна Сяргееўна адзначыла, што прыемна было, калі ў калектыў прыходзілі новыя ўдзельнікі, якія таксама любілі



песні сваіх бацькоў. На змену сваім матулям і свякроўкам прыйшлі Соф'я Мікалаеўна Собаль, Вольга Кірылаўна Хамёнак, Аляксандра Іванаўна Рудзёнак, Валянціна Канстанцінаўна Шнітко, Вера Якаўлеўна Дунец і зноў гучала песня.

Ім аніколі не была чужою народная песня, якая на нашай Ушаччыне перадавалася з вуснаў у вусны, з пакалення ў пакаленне.

Гэтыя вясковыя працаўніцы-пявунні з дзяцінства чулі, як спявалі іх бабулі і дзядулі, іх бацькі, аднавяскоўцы, а потым і самі падключыліся да таго велічнага ”хору“, калі можна так сказаць.

Першае выступленне гурта на публіцы з поспехам прайшло ў Матырынскім сельскім Доме культуры ў форме ”Вясковых вячорак“ зімою 1987-га. Пра тое, што рыхтуецца

творчая імпрэза новага калектыву, паведамлялі афішы, навіну перадавалі сябрам-суседзям артысткі, а тыя – сваім знаёмым. Такое ”сарафаннае радыё“ спрацавала выдатна: усе 220 пасадачных месцаў у актавай зале запоўніліся. Падстаўлялі дадатковыя крэслы, а некаторыя вяскоўцы глядзелі прадстаўленне і стоячы. Атрымалася яно, па словах Галіны Сяргееўны, вельмі яркім. Артысткі выйшлі на сцэну ў нацыянальных касцюмах і нават у лапцях. Гледачы ж потым, пасля канцэрту, казалі: ”Вось, усё на месцы: і кіраўнік, і артысты!“

Першы поспех усіх акрыліў. Наступнае выступленне было ўжо на раённым аглядзе-конкурсе: занялі там першае месца. Так і прыйшла да гурта ”Матырынская спадчына“ вядомасць, адкрыліся шляхі на іншыя канцэртныя пляцоўкі. І выступалі артысты з Матырына ўжо не толькі ў вёсцы, але і за яе межамі. А ў канцы 1987-га гурт запрасілі на Рэспубліканскае тэлебачанне: паўдзельнічаць у папулярнай на той час перадачы ”Запрашаем на вячоркі“ з абрадам ”Жаніцьба Цярэшкі“. Што, дарэчы, было вельмі своечасова, бо гэтая абрадавая гульня праводзіцца якраз на Каляды.

Так тэлебачанне раскруціла вясковы гурт. Прыйшла слава. Пазней матырынскія артысткі выступалі на ”Славянскім базары ў Віцебску“. Пра іх творчасць былі сюжэты ва ўсебеларускіх тэлеперадачах ”Крок“, ”Паўстанак“. І абласное тэлебачанне аддало належнае талентам з глыбінкі: прадстаўляла ”Матырынскую спадчыну“ ў праекце ”Беларусь – мая песня“.

## НЕ З НОТ, А З ГОЛАСУ: АЎТЭНТЫЧНА

З гадамі пашыраўся рэпертуар гурта, адточвалася сцэнічнае майстэрства артыстак. Гурт запрашалі ўжо на розныя мерапрыемствы раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўню. У 2002-м ён меў гонар выступаць на Рэспубліканскім свяце ”Дажынкі“ ў Полацку. Паступалі прапановы з розных устаноў: прыедзьце, паспявайце! І што важна: вялікі інтарэс да народнай творчасці праявілі спецыялісты з профільных ВНУ. У прыватнасці, у гурта ”Матырынская спадчына“ ўсталявалася даволі плённае супрацоўніцтва з Віцебскім дзяржаўным педуніверсітэтам імя П. М. Машэрава, Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, Наваполацкім каледжам культуры.

Тут варта нагадаць, што ў цяперашняй практыцы ёсць так званы аўтэнтычны спосаб, ці метад навучання студэнтаў. Гэта навучанне народным спевам не з нот, а з голасу, з аўдыё - і відэазапісаў. Але ж дзе браць тыя запісы? За аснову бяруцца жывыя галасы выканаўцаў, пераважна тых, што самі жывуць у глыбінцы і зберагаюць мясцовыя традыцыі фальклорных спеваў. Вось і глянуліся спецыялістам гэтыя галасістыя жанчыны з Матырына. На базе гурта праходзілі рознага роду абласныя, занальныя і раённыя семінары работнікаў устаноў культуры. Артысты ўдзельнічалі ў міжнароднай канферэнцыі ”Спеўная этнічная Віцебшчына“. У 2014-м матырынцы наведалі Белдзяржуніверсітэт культуры і мастацтваў, дзе праходзіла міжнародная канферэнцыя ”Аўтэнтычны фальклор і яго захаванне“, а яшчэ давалі майстар-клас на абласным семінары ў Наваполацку для метадыстаў па народнай творчасці.

Васіль Шалак у сваёй кнізе ”Роздум“ прыгадвае пра тое, што ў 2015 годзе бачыў мінскіх студэнтаў на фестывалі ”Славянскі кірмаш“ у Санкт-Пецярбурзе. Ад іх ён даведаўся, што фальклорны гурт з Матырына паказваў ім розныя абрады: ”Жаніцьба Цярэшкі“, ”Зажынкі“, ”Дажынкі“ ды іншыя. Прычым з адпаведнымі песнямі ды танцамі. Былі ў іх і сумесныя творчыя выступленні, ад якіх задавальненне атрымалі і вясковыя артысты, і мінскія студэнты, і гледачы. Ну, а ў Санкт-Пецярбурзе гэтыя студэнты іх прадэманстравалі гледачам фестывалю.

17 студзеня 2004 года калектыў ”Матырынская спадчына“ атрымаў званне ”народны“. Ганаровыя званні дыпламантаў і лаўрэатаў, шматлікія прыхільнікі – усё гэта неад’емная частка творчага жыцця артыстаў, якія карыстаюцца папулярнасцю не толькі сярод мясцовага гледача, але і на абласных, рэспубліканскіх узроўнях: дыпламант заключнага абласнога агляду-конкурсу фальклорнага мастацтва Віцебшчыны ў рамках І Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва ”Беларусь – мая песня“ (1997 - 1998 гг.), дыпламант заключнага абласнога агляду-конкурсу фальклорнага мастацтва Віцебшчыны ў рамках ІІ Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва ”Беларусь –мая песня“ (2005г.), дыпламант абласных фестываляў фальклорных калектываў (2000г.), народнай харэаграфіі ”Беларуская полька“ (2000г.), удзельнік ІІ Рэспубліканскага свята працаўнікоў вёскі ”Дажынкі – 2002“ у горадзе Полацк. Лаўрэат абласнога свята абрадавага фальклору ”Купалле Паазер’я“ (2006, 2009, 2011, 2012гг.), лаўрэат абласнога свята-конкурсу вясельных абрадаў Віцебшчыны ”Вялікая вясельніца“ (2009, 2012, 2015, 2017, 2019).

Аўтэнтычная захаванасць спеўнай і танцавальнай традыцыі свайго рэгіёна вызначае творчую самабытнасць калектыву. ”Матырынская спадчына“ вядзе вялікую работу па збору, зберажэнню, захаванню традыцыйных святаў і абрадаў, існуючых на тэрыторыі Ушацкага раёна.

Аснову рэпертуару калектыву складаюць каляндарна-земляробчыя, сямейна-абрадавыя, пазаабрадавыя песні, побатавыя танцы, прыказкі, прыпеўкі, беларускія абрады.

Работа народнага фальклорнага калектыву шырока папулярызуецца ў сродках масавай інфармацыі. Калектыў з’яўляўся ўдзельнікам тэлевізійнай праграммы ”Запрашаем на вячоркі“ (1987г.), тэлеперадач ”Крок“ (1993г.), ”Палустанак“ (2009г.), тэлевізійных праектаў ”Зорны шлях“ (2013г.), ”Наперад у мінулае“ (2015г.). Па фальклорных знаходках ”Матырынскай спадчыны“ зняты відэафільмы ”Першы дзень у маладой“, ”Дарога да вянца“, ”Абрадавая ежа. Клёцкі з душамі“. Зроблены відэазапіс 19 побытавых танцаў, якія існавалі на Ушаччыне.

Фальклорны калектыў ”Матырынская спадчына“ – ўдзельнік X і XIII Міжнародных навуковых канферэнцый па фальклору ”Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання“ (г. Мінск, 2014, 2016 гг.).

Добра вядома, што кожны год фальклорны ансамбль праводзіць абрады ”Калядаванне“, ”Валачобнікі“, ”Зажынкі“, ”Дажынкі“, традыцыйную гульню ”Жаніцьба Цярэшкі“, святы ”Купалле“, ”Багач“. За час сваёй творчай дзейнасці калектыў змог адрадзіць і такія абрады як ”Радзіны“ і ”Вясельніца“, а таксама многія песні народных свят. З удзелам калектыву зроблены відэафільмы ”Першы дзень у маладой“, ”Дарога да вянца“, ”Абрадавая ежа. Клёцкі з душамі“, праведзены здымкі 19 бытавых танцаў, якія танцавалі на Ушаччыне. Фальклорны калектыў прымаў

удзел у здымках тэлеперадачы ”Запрашаем на вячоркі.“ ”Матырынская спадчына“ з’яўляецца актыўным удзельнікам раённых, абласных, рэгіянальных, міжнародных свят, конкурсаў.

Яго выступленні адрозніваюцца высокім выканаўчым майстэрствам самадзейных артыстаў і самабытнай пастаноўкай канцэртных праграм. За час свайго існавання калектыў заваяваў званне ”Народны калектыў“, неаднаразова выступаў на пляцоўках многіх раённых цэнтраў Віцебскай вобласці, у абласным цэнтры і ў сталіцы Беларусі. Выступленні ”Матырынскай спадчыны“ неаднаразова бачылі гледачы абласнога і рэспубліканскіх тэлевізійных каналаў. Іх творчасць сістэматычна вывучаюць студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтва на кафедры этналогіі і фальклора.

# ПЕСНЯМ НЕ БУДЗЕ КАНЦА

Самадзейным артыстам народнага фальклорнага гурта ”Матырынская спадчына“ з Ушаччыны вельмі прыемна сёння бачыць, што народнай творчасцю, яе глыбіннымі каранямі не проста цікавяцца, а вельмі грунтоўна займаюцца маладыя людзі, прыгожыя хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце да 20 гадоў. Як адзначыла Г.С.Рудзёнак, яны ўжо цяпер так спяваюць, што заслухаешся. Размаўляе Галіна Сяргееўна з такой моладдзю ды радуецца: нашым песням не будзе канца! Яны будуць і надалей жыць, уплываць на свядомасць, пачуцці кожнага, хто іх пачуе. І якая ж гэта радасць для матырынскіх спявачак: бачыць, што праца, якой займаюцца яны без малога трыццаць гадоў, не марная, патрэбная для грамадства. Удалося захаваць пераемнасць традыцый. Сёння народная культура – запатрабаваная, і гурт ”Матырынская спадчына“ будзе мець працяг.

– Цяпер у нас ужо чацвёрты склад удзельнікаў. Гурт пастаянна абнаўляецца, бо, на жаль, сыходзяць з яго не толькі па стане здароўя: сыходзяць і з жыцця. Але, на шчасце, месцы тых, хто, як кажуць, даспяваў сваю песню, запаўняюць іншыя, больш маладыя артысткі, аматары фальклорнай творчасці. Першы прыток маладых сіл быў яшчэ ў 1998 годзе. Цяпер у ”Матырынскай спадчыне“ спяваюць таксама Марыя Пракаповіч, Аляксандра і Наталля Рудзёнак, Соф’я Собаль, Валянціна Шнітко, Аліна Федуковіч, прычым апошняя яго ўзначальвае з красавіка 2018 года.

Цяпер Галіна Рудзёнак працуе метадыстам па народнай творчасці ва Ушацкім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці. Аднак не пакінула яна і свой гурт: застаецца яго куратарам не толькі па новай пасадзе, але і па сэрцы. Вельмі ўдзячная ўсім артыстам за іх працу, за творчасць. Бо гэта ж

дзякуючы супольнай дзейнасці звычайныя, здавалася б, вясковыя жанчыны сталі вядомымі і ў раёне, і, напрыклад, нават у далёкім Санкт-Пецярбурзе.

Пра ”Матырынскую спадчыну“, дарэчы, па-ранейшаму пішуць журналісты розных выданняў, вясковыя артысткі – гераіні шматлікіх тэле- і радыёперадач. Звесткі пра фальклорны гурт з Матырына ўнесены ў кнігу Памяць Ушацкага раёна, у энцыклапедыю ”Культура Прыдзвіння“. Сама ж Галіна Рудзёнак абнадзеіла: ”Пакуль мы запатрабаваныя – гурт ”Матырынская спадчына“ будзе спяваць, жыць, працаваць“.

У маі 2017 года фальклорны ансамбль ”Матырынская спадчына“ адзначыў 30-годзе сваёй творчай дзейнасці. Віншаванне самадзейных артыстаў праходзіла ў раённым цэнтры культуры і народнай творчасці. Раённая газета ”Патрыёт“ напісала аб гэтым калектыве: ”І хоць не ведалі многія ўдзельніцы калектыву нотнай граматы, ад душы, па крупінках збіралі песенную і музычную спадчыну роднага краю, неслі ў народ найвялікшую каштоўнасць: тое, што было створана продкамі, чым багата матырынская зямля“.

Зараз рэпертуар калектыву складае больш за 80 каляндарных і сямейна-бытавых абрадавых песень, больш за 20 мясцовых бытавых танцаў. Нельга ўявіць, напрыклад, раённых ”зажынак“без песень “Матырынскай спадчыны” з сімвалічным першым снопам.







Галоўным вынікам сваёй дзейнасці самадзейныя артысты лічуць з’яўленне творчага калектыву-спадарожніка



”Спадчына“, які быў створаны ў 1995 годзе.

З вялікай радасцю Галіна Сяргееўна расказвае пра ”Спадчыну“, якая і зараз папаўняецца прадстаўнікамі маладога пакалення. Юныя артысты пераймаюць традыцыі, мясцовыя абрадавыя песні і танцы.

За час існавання змяніўся не адзін састаў удзельнікаў. Зараз у калектыве 16 чалавек. Калектыў праводзіць вялікую работу па адраджэнню, захаванню нацыянальнай культуры. З мэтай вывучэння нематэрыяльных культурных каштоўнасцей і захавання снеўнага стылю Ушацкага рэгіёну, удзельнікі калектыву збіраюць і запісваюць абрадавыя песні ад жыхароў раёна. У 2016 ”Спадчына“ атрымала званне ”абразцовы“.




Рэпертуар калектыву ”Спадчына“ яшчэ не такі вялікі як ў ”Матырынскай спадчыны“, але ўжо складаецца з 27 побытавых танцаў, 32 абрадавых песен, хараводаў і абрадаў.

Калектыў з’яўляецца актыўным удзельнікам раённых, абласных, святаў, аглядаў, конкурсаў.

Што іх аб’ядноўвае? Менавіта любоў да гісторыі і культуры свайго народа. Прыемна бачыць, што моладзь вучыцца ў старэйшага пакалення танцам, песням, якія яны танчылі ў гады сваёй маладосці. Народныя песні і танцы нельга нічым замяніць, яны павінны прысутнічаць у выхаванні маладога пакалення.

На змену прыйшло падрастаючае пакаленне. Гэта дзеці ад 8 да 10 гадоў. Многія думаюць, што станцаваць народны танец вельмі проста, але гэта далёка не так. Трэба запомніць шмат рухаў, адчуваць рытм танца, станцавацца з партнёрам, а рухаў нагамі і рукамі не злічыць!

Жыццё працягваецца, працягваецца і дзейнасць калектываў ”Матырынская спадчына“ і ”Спадчына“, а значыць працягвае жыць народная песня і танцы.

# ВЫКАРАСТАНАЯ ЛІТАРАТУРА


1. Барадзёнак, Т. Мелодыі роднага краю / Т. Барадзёнак // Віцебскі рабочы. – 1995. – 29 красавіка. – С. 5.

2. Варатынская, Г. Нават танцавалі дома сям’ёй / Г. Варатынская // Патрыёт (Ушачы). – 2006. – 7 кастрычніка. – С. 2.

3. Варатынская, Г. Спадчынай матырынскай багатыя / Г. Варатынская // Патрыёт (Ушачы). – 2012. – 26 мая. – С. 5.

4. Дзянісаў, В. З песняй па жыцці / В. Дзянісаў // Патрыёт (Ушачы). – 2007. – 14 красавіка. – С. 7.

5. Ждановіч, І. Артысткі, якіх пашукаць! / І. Ждановіч // Сельская газета. – 2017. – 5 июля. – С. 10.

6. Кавалеўская, К. Жыццё – як песня / К. Кавалеўская // Патрыёт (Ушачы). – 2017. – 20 верасня. – С. 4.

7. Кавалеўская, К. Жыццё іх песняю спавіта / К. Кавалеўская // Патрыёт (Ушачы). – 2017. – 24 мая. – С. 5.

8. Рудёнок, Г. С. Матыринский народный фольклорный коллектив ”Матырынская спадчына“ / Г. С. Руденок // Регионы Беларуси : энциклопедия в 7 т. / редкол. : Т. В. Белова [и др.]. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 322.

9. Рудзёнак, Г. С. Вясельныя традыцыі в. Матырына Ушацкага раёна / Г. С. Рудзёнак // Народная культура Віцебшчыны : вывучэнне, захаванне, папулярызацыя / рэдкал. : Л. Вакар, Л. Кернажыцкая, В. Шышанаў. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2012. – С. 209-210.

10. Рудзёнак, Г. С. Спявачкі з Матырына / Г. С. Рудзёнак // Памяць : Ушацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск : Белта, 2003. – С. 571-572.

11. Рудзёнак, Н. Захоўваюць фальклорны скарб / Н. Рудзёнак // Патрыёт (Ушачы). – 2016. – 13 красавіка. – С. 4.

12. Рудзёнак, Н. ”Матырынская спадчына“ / Н. Рудзёнак // Патрыёт (Ушачы). – 2010. – 26 сакавіка. – С. 4.

13. Смыслова, Л. Матырынскі гучны спеў / Л. Смыслова // Патрыёт (Ушачы). – 2002. – 16 мая. – С. 3.

14. Шалак, В. И. Роздумья. Об истории, настоящем и будущем деревни Матырино / В. И. Шалак. – Санкт-Петербург : ИПК ”Береста“, 2018. – 376 с.

15. Шпакоўская, Г. З глыбіні часоў : гадавое кола святаў і абрады ў спевах адрадзілі ў вёсцы Матырына на Ушаччыне / Г. Шпакоўская // Витебские вести. – 2017. – 27 июля. – С. 20.

**Матырынская спадчына : гісторыя і сучаснасць /** / складальнік Настасся Змітрачэнка ; камп’ютарны дызайн Г. М. Кашненка. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2021. – 22 с. : парт.

Ушацкая раённая
бібліятэка імя Е.Я.Лось
вул. Ленінская, 32,
Ушачы, 211524
тэлефон: 8(02158) 5-17-74
Email: ushlib@inbox.ru
htt://bibush.by/

